*Цікава ведаць*

# Без стэрэатыпаў



У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў ёсць выдатны калектыў з гучнай назвай «Талака» — так у старадаўнія часы называлася дапамога ўсёй вёскай. Пасля цяжкай працы жыхары збіраліся разам і ладзілі свята. Калектыў знішчае стэрэатып пра тое, што фальклор любяць толькі бабулі: удзельнікі гурта — яркія і крэатыўныя маладыя людзі. У аснове рэпертуара — каляндарныя песні, побытавыя танцы і гульні, сабраныя ў этнаграфічных экспедыцыях па ўсёй Беларусі. Музычны інструментарый «Талакі» складаюць дуды, скрыпкі, гуслі, цымбалы, бубен і керамічныя ўдарныя інструменты. Кіраўнік калектыву — Вячаслаў Калацэй, хормайстры — Таццяна Пладунова і Эвеліна Шчадрына. «Талака» — дыпламант фестываляў студэнцкай музыкі «Belfort» у 2003 і 2007 гадах (Францыя), «Покровские колокола — 2006» (Вільнюс), «Slaavi valgis — 2013» (Эстонія), «Как на речке было на Фонтанке — 2013» (Санкт-Пецярбург).

**Паліна ДУДАРАВА, фота аўтара**